■ Нашы

# БЕЛАРУС З САХАЛІНА




Анастас Семяновіч выпісвае «Звязду» больш як 60 гадоў.

## На Міншчыне жыве чытач «Звязды» з 60-гадовым стажам, бацька якога служыў у Мікалая II і меў падарунак ад Жукава

**У госці да Анастаса Семяновіча з Бараўлян наш звяздоўскі дэсант накіраваўся з вялікім інтарэсам. І не толькі таму, што Анастас Лявонцьевіч больш як 60 гадоў выпісвае «Звязду» (хоць, пагадзіцеся, такіх падпісчыкаў сёння можна пералічыць па пальцах). А і таму, што гэты жвавы, вясёлы чалавек, якому ўжо пайшоў дзявяты дзясятак, абяцаў расказаць нам не адну цікавую гісторыю. І не схлусіў: расповеды пачаліся адразу ж, як мы выйшлі з маршруткі...**

### Падарунак ад Жукава

Пакуль крочылі ў бок дома, наш спадарожнік расказаў, як маршал Жукаў падарыў яго бацьку нямецкую аўчарку. Толькі маршалам Георгій Канстанцінавіч тады яшчэ не быў. У 1936 — 1937 гадах будучы палкаводзец служыў у Слуцку — камандаваў 4-й кавалерыйскай дывізіяй імя Варашылава. Старэйшы Семяновіч быў у яго забеспячэнцам. За добрую службу Жукаў і аддаў яму свайго сабаку.

— У гады Вялікай Айчыннай вайны немцы тройчы забіралі Грэкса (нямецкую аўчарку, падораную Жукавым. — **Аўт.**), — расказвае Анастас Лявонцьевіч. — І тройчы давалі за яго паўмяшка солі. Але жывёлу не падманеш: сабака ўсё роўна вяртаўся дамоў.

З таго часу ў сям'і Семяновічаў цэняць сабачую вернасць. І як доказ — аўчарка Люкс, якая, пачуўшы свайго гаспадара, ад радасці ледзь не пераскочыла плот. Убачыўшы нас, сабака насцярожыўся. І пакуль Анастас Лявонцьевіч не пераканаў яго, што мы — яго госці, не супакоіўся. Але Люкса ўсё роўна прыйшлося навязаць (вялікіх сабак баюся яшчэ з дзяцінства).

### Анастасія мужчынскага роду

У трохпавярховым асабняку Анастас Семяновіч жыве адзін. Калі, вядома, не лічыць Люкса, кошку Кацю і некалькіх курачак. На выхадных вялікі дом напаўняецца галасамі дзяцей і смехам унукаў. Ды і ў будні пенсіянеру няма калі сумаваць: трэба працаваць на градах, патрабуе ўвагі і прысядзібная тэрыторыя. З агародам Анастас Лявонцьевіч па магчымасці спраўляецца сам. Ведае, што дзеці яго за гэта не пахваляць, але затое на градках — ні травінкі.

Пакуль п'ём гарбату, пытаюся ў гаспадара, адкуль у яго такое незвычайнае імя.

— Калі ў 1944 годзе пайшоў у сельскі Савет па пасведчанне аб нараджэнні, у графе «Імя» мяне запісалі як Анастасія, — кажа суразмоўца. — Відаць, пераблыталі: так звалі маю сястру. У той час моцна не думалі. Замест таго, каб перарабіць дакумент, перапісалі апошнюю літару. Сказалі, Анастасіем буду. Так у мяне з'явілася новае імя. Хоць дагэтуль звалі мяне ўсе Станіславам.



Бацька Анастаса Семяновіча ахоўваў цара Мікалая II.

### На службе ў цара

— Калі мяне пытаюць, адкуль я родам, кажу: з Сахаліна, — працягвае Анастас Семяновіч. — «Ты ж беларус», — чую ў адказ. Так, беларус. Але нарадзіўся ў Сахаліне — пасёлак такі ёсць на Случчыне.

Сям'я Семяновічаў была вялікая: шасцёра дзяцей. Яшчэ некалькі памерлі немаўлятамі. Жылі нядрэнна. Кожнай сям'і вылучылі па 60 сотак. «У нас усё было: і пшаніцу сеялі, і проса, — прыгадвае суразмоўца. — У мяне і цяпер па завядзёнцы ранній вясной амаль усё пасаджана».

Увесь час мянялася ўлада — вось чаго баяліся больш за ўсё. Быў момант, калі ўслед за Мікалаем II мог трапіць і старэйшы Семяновіч. Аказваецца, селянін з-пад Слуцка ахоўваў цара. Захаваўся нават фотаздымак, дзе ён у прыгожай форме нясе сваю службу.

— Мікалая II у асноўным ахоўвалі беларусы, — расказвае малодшы Семяновіч. — Напэўна, больш адданых і добрых людзей не было. Па ўспамінах бацькі, цар быў вельмі мудрым чалавекам. Бацька расказваў, што Мікалай II адчуваў, чым усё скончыцца, і загадаў ім уцякаць. Не забыўся і аддзячыць за службу.

### Толькі «Звязду»!

Калі ў 1950 годзе Анастас Семяновіч прыйшоў у ваенкамат, яму крышачку прыйшлося схітрыць. Сказаў, што ўжо паўналетні (хоць было толькі 17) — вельмі ж хацеў у армію. Узялі ў лётную часць, у Баранавічы. Пасля курсу маладога байца накіравалі служыць у Германію.

Там Анастас Семяновіч абслугоўваў самалёты. «МіГ-15, МіГ-17, МіГ-19», — пералічвае ён. Служыў непадалёк ад Дрэздэна. У 1955 годзе старшы сяржант Анастас Семяновіч дэмабілізаваўся. Уладкаваўся на трактарны завод электрыкам, за год скончыў тры класы (8, 9 і 10).

— Тады ж мне і прапанавалі выпісаць якуюнебудзь газету, — успамінае Анастас Лявонцьевіч. — Розныя былі варыянты. Я ж сказаў, што выпішу толькі «Звязду». Мову люблю з дзяцінства. І тады, і цяпер чытаю толькі па-беларуску. На беларускай мове ўвесь час размаўлялі з жонкай.

За плячыма Анастаса Семяновіча — два інстытуты: політэхнічны (цяперашні БНТУ) і інстытут Губкіна (сёння Расійскі дзяржаўны універсітэт нафты і газу імя Губкіна), які скончыў з адзнакай. У Вышэйшай партыйнай школе вучыўся ў Германіі. Амаль 40 гадоў Анастас Лявонцьевіч адпрацаваў у Белтрансгазе галоўным спецыялістам Дзяржнагляду СССР, стаў заслужаным работнікам Мінгазпрама СССР.

### Назваў вуліцу

Анастас Лявонцьевіч жыве на вуліцы з прыгожай назвай — Бярозавы Гай. Толькі мала хто ведае, што менавіта ён так яе назваў. Дом Семяновічаў з'явіўся тут адным з першых. І калі мужчына перабраўся сюды са сталіцы, вуліца была безназоўная.

— А як гэта, каб без назвы? — не разумее пенсіянер. — Я пайшоў у сельскі Савет і ўнёс сваю прапанову. А ў мяне пытаюць, чаму так, а не гэтак. А я і кажу: ідзіце і паглядзіце, колькі ў нас бяроз расце, і пытанне адразу знікне.

Гэта цяпер ад тых бяроз амаль нічога не засталося. Прыроду выцеснілі новыя асабнякі. А некалькі дзесяцігоддзяў таму тут быў сапраўдны бярозавы гай. «У мяне ўвесь агарод быў у бярозах! — удакладняе суразмоўца. — Штук восем і сёння нагадваюць аб тых гадах. А які смачны з іх сок!»

***

На сок мы, вядома, ужо спазніліся. Хто яго ведае, можа, пакаштуем яго наступным разам. Да такога суразмоўцы з задавальненнем прыедзеш яшчэ. Ды і адной сустрэчы Анастасу Лявонцьевічу не хапіла, каб расказаць усе свае гісторыі. Упэўнена, за год іх стане яшчэ больш. А калі і не, то з ім цікава і проста пагаварыць.

**Вераніка КАНЮТА.**
kanyuta@zviazda.by
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА**

■ У трэндзе

# ТЫ МАЛАДЫ,

## пакуль дапамагаеш старэйшым



**Вы лічыце, што валанцёрства — гэта толькі для студэнтаў? Вольга Пуцінцава сваім прыкладам даказвае, што клапаціцца пра іншых трэба ў любым узросце. Яна заснавала праект «Пажылыя — старым», у якім пенсіянеры дапамагаюць людзям, старэйшым за іх. Адразу адгукнуліся яшчэ некалькі актывістаў і арганізавалі атрад «Клопат».**

Гэтае аб'яднанне працуе ў Першамайскім раёне сталіцы. Зараз у пяці валанцёраў – дзевяць падапечных. Каб далучыцца да атрада, трэба мець адпаведныя асобасныя якасці: жвавы характар, схільнасць да самаразвіцця і лідарства.

Аднадумцы Вольгі Пуцінцавай не толькі іншым дапамагаюць, але і самі шмат вучацца. Яны ўдзельнічаюць у адукацыйных праграмах пры Беларускім таварыстве Чырвонага Крыжа. Так, яны могуць самастойна даглядаць цяжкахворых і аказваць псіхалагічную дапамогу ў крызісных сітуацыях. Навыкі вельмі зручныя, бо валанцёры сутыкаюцца з рознымі выпадкамі.

Часцей за ўсё дапамога патрэбна ў побыце. Усе навіны з Міністэрства працы і сацыяльнай абароны перадаюць валанцёры. Дапамагаюць са штодзённымі клопатамі, зборам дакументаў. Аднак зрэдку прыходзіцца нават звяртацца разам у суд. Вольга Мікалаеўна расказвае, што такое было двойчы. Часам падапечныя церпяць ад сваіх жа знаёмых. Так, сусед адной з пенсіянерак зламаў ёй руку дзвярыма. Прыйшлося звяртацца да праваахоўнікаў па пакрыццё шкоды. Грошы выплацілі. Але ці бяспечна жыць адзінокім старым побач з такімі суседзямі?

Вольга Мікалаеўна ганарыцца сваімі падапечнымі. У кожнага з іх быў няпросты лёс. Ёсць сярод іх і вязень фашысцкіх лагераў, і жыхар блакаднага Ленінграда. А Зінаіда Падабед, якой сёлета спаўняецца 95 гадоў, удзельнічала ў Сталінградскай бітве. У сваёй сям'і яна была самым малодшым, трынаццатым дзіцем. Паступіла ў Мінск у педагагічны інстытут, але недавучылася — пачалася вайна. Услед за сястрой эвакуявалася ў Бузулук Чкалаўскай вобласці (цяпер Арыенбургская).

Там Зінаіда Рыгораўна пачала працаваць на швейнай фабрыцы, але не змагла спакойна жыць у тыле. І ўвесну 1942 года пайшла добраахвотніцай на фронт. Пасля Сталінградскай бітвы іх полк быў перакінуты ў Запаляр'е. Там, у дзеючай арміі, яна і заставалася да Перамогі.

Цяпер жыве разам з сынам. Ён, як гаворыць Зінаіда Грыгор'еўна, ярэ «жывая палачка». А Вольга Мікалаеўна — самая надзейная сяброўка. Заўсёды дапамагае ў цяжкіх сітуацыях.

Валанцёры разам са сваімі падапечнымі ладзяць культурныя вечары: спяваюць, чытаюць вершы, паказваюць убранне, зробленае сваімі рукамі, сустракаюцца з малодшым пакаленнем. Так складаецца калектыў. Існуе ў іх і Майстэрня добрых спраў. Тут яны робяць сувеніры, рамантуюць адзенне, сустракаюцца ў гуртку па інтарэсах.

Вольга Мікалаеўна заўсёды імкнецца арганізаваць такія сустрэчы, бо многія з яе падапечных жывуць адны і нават паразмаўляць бывае няма з кім. Такая непадробная неабыякавасць да лёсу іншых людзей выхавалася ў яе з дзяцінства. Нарадзілася яна ва Украіне і рана засталася без бацькоў. Яны былі педагогамі. Вырасці і навучыцца рабіць нейкія справы па гаспадарцы ім з сястрой дапамагалі суседзі і сябры сям'і. Сярод іх было шмат вучняў бацькоў. Так і гадаваліся яны, дапамагаючы адна адной.

Сёння, кажа Вольга Пуцінцава, у маладых зусім іншыя ідэалы, таму і адыходзіць ад спраў нельга. Валанцёрства — гэта не проста хобі, а лад жыцця. Свой дзень Вольга Мікалаеўна плануе, зыходзячы з патрэб сваіх падапечных. А што можам зрабіць мы? Звярнуць увагу на сваіх бабуль і дзядуляў ці дапамагчы пажылой суседцы па пад'ездзе. Часам нават спытаць пра справы і падтрымаць словам будзе дастаткова, каб разнастаіць і абагрэць іх дзень.

**Надзея АНІСОВІЧ**